**Малашэня, Л.** Не знікнуць памяці крыніцы / Л. Малашэня // Беларускі час. – 2012. – 2 марта. – С. 8.

## НЕ ЗНІКНУЦЬ ПАМЯЦІ КРЫНІЦЫ

У бібліятэчнай сістэме Полаччыны 33 філіялы. І кожны з іх далучыўся да гэтай высакароднай справы. Бібліятэкары вечарамі і ў выхадныя дні абыходзілі старых людзей, запісвалі, што яны памятаюць. Потым здавалі свае запісы ў цэнтральны полацкі філіял, дзе тэксты набіралі на камп'ютары, сістэматызавалі, ілюстравалі і ўкладалі ў кнігу. Раздрукавалі яе на ўласным прынтары колькасцю 6 экзэмпляраў, пераплялі і цяпер з гонарам паказваюць усім наведвальнікам.

А ганарыцца сапраўды ёсць чым. На 200 старонках адлюстраваны паданні, запісаныя ў 98 населеных пунктах. Маўклівымі сведкамі мінуўшчыны выступаюць 32 возеры, а таксама крыніцы, горы, валуны роднага краю, паэтычна ўплеценыя ў канву самабытных гісторый. «Мы і самі не чакалі, што інфармацыі будзе так шмат», – кажа каардынатар праекта, загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу Валянціна Цыганкова.

На просьбу назваць самую цікавую легенду Валянціна Пятроўна заўважае, што кожная з іх па-свойму каларытная. Адны тлумачаць паходжанне вёсак, другія ўказваюць на крыніцы з гаючай святой вадой, трэція распавядаюць пра шчымлівае каханне.

«Чароўны і ўтульны куточак Полаччына. Нашы мясціны вабяць усіх, хто жадае адкрыць новыя старонкі гісторыі, сэрцам дакрануцца да казачнай прыгажосці родных краявідаў», – напісалі ў прадмове да кнігі яе складальнікі. З удзячнасцю і цеплынёй расказваюць яны пра жыхароў свайго краю – прыгожых, працавітых, сумленных і шчодрых людзей, што берагуць у сэрцах святую мудрасць прашчураў і далікатна перадаюць яе ўнукам і праўнукам.

– Цікавасць супрацоўнікаў бібліятэк да гісторыі роднага краю вельмі пахвальна, бо дазваляе адчуць і зразумець непаўторнасць той Полаччыны, пра якую не гаворыцца ў энцыклапедыях і падручніках, – лічыць кандыдат гістарычных навук, даследчык традыцыйнай культуры Беларусі Уладзімір Лобач.

– Пакаленне людзей, якія валодаюць гэтымі ведамі, імкліва знікае. Таму трэба спяшацца сабраць і захаваць усе крупінкі народнай мудрасці для нас саміх і будучых пакаленняў.

Акрамя таго, легенды і паданні нашага краю цікавыя не толькі з побытавага пункту погляду. Яны маюць і навуковую вартасць, бо часта ўказваюць на археалагічныя помнікі, у тым ліку невядомыя да гэтага часу. Напрыклад, з гарадзішчамі жалезнага веку звычайна звязваюць паданні пра храм, які праваліўся пад зямлю, а так званыя французскія магілы нярэдка ўказваюць на курганныя пахаванні X–XII стагоддзяў.

Дыяментамі народнай мудрасці сёння могуць узбагаціцца чытачы бібліятэк. Па словах дырэктара раённай ЦБС Ганны Бурносенкі, плануецца раздрукаваць кнігу ў большай колькасці экзэмпляраў. А збор матэрыялаў полацкія энтузіясты мяркуюць працягнуць, каб духоўная сувязь пакаленняў пракладала дарогу да сэрцаў і душ нашчадкаў.

***Ларыса Малашэня***